Ліпень Я.П.,
канд. гіст. навук,
дацэнт

## СУЧАСНЫ СТАН ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ

Сямейныя абрады з'яўляюцца часткай народнага побыту, укладу сям'і. Яны дапамагаюць кожнай канкрэтнай сям'і з годнасцю адзначыць важныя падзеі ў цыкле чалавечага жыцця. Адным з устойлівых кампанентаў традыцыйнай побытавай культуры з'яўляецца вясельная абраднасць, якая адлюстроўвае асаблівасці
этнасу ў плане этнадыферэнцыяцыі. Вясельная абраднасць узыходзіць да часоў першабытнага ладу, але ў залежнасці ад грамадска-палітычных фармацый яна змянялася. У абраднасці прасочваюцца старадаўнія формы, звычаі, уяўленні (вераванні) пра сямейна-шлюбныя адносіны ў розныя гістарычныя эпохі. Стрыжань
заставаўся, змяняліся асобныя рытуалы, дзеянні, кожная эпоха напаўняла іх сваім сэнсам. Але жывучасць старадаўніх абрадаў даволі моцная, і многія з іх захаваліся да нашых дзён у поўным або змененым выглядзе. Захаваліся асобныя этапы, складовыя часткі, дзеючыя асобы. Некаторыя дзеянні з рацыянальных ператварыліся ў забаўку, гульню або набылі сімвалічны характар.

Традыцыйнае вяселле ў цяперашні час ужо не мае цэльнага драматычнага дзеяння, а складаецца з асобных эпізодаў, уключаючы пры гэтым шэраг новых элементаў. Напрыклад, такі перадвясельны абрад, як сватанне, ў сваёй традыцыйнай форме сустракаецца даволі рэдка, хоць і захоўвае некаторыя спецыфічныя атрыбуты, сімволіку, дзеянні. Заўважана скарачэнне некалі традыцыйных запоін, заручын, а ў асобных выпадках яны аб'ядналіся са сватаннем. Амаль знікае такі традыцыйны абрад, як дзявочы вечар (суборная субота, вянкі). Важнай падзеяй сучаснага вяселля з'яўляецца рытуал грамадзянскай рэгістрацыі шлюбу, формы якога, галоўным чынам, вызначаюцца існуючым дзяржаўным ладам. Афіцыйная рэгістрацыя шлюбу існуе ў дзвюх асноўных формах: звычайная рэгістрацыя, і рэгістрацыя, якая адбываецца ва ўрачыстай абстаноўцы. Сярод гарадскога насельніцтва абрад урачыстай рэгістрацыі распаўсюджаны ў большай ступені, чым сярод сельскага. У афіцыйным абрадзе рэгістрацыі шлюбу можна адзначыць як асобныя элементы народных традыцый, так і новыя рысы. Некаторыя элементы дамашняй часткі абраду пераносяцца ў афіцыйную, што зніжае яго ўрачыстасць, парушае акцэнты шлюбнай падзеі.

Частка насельніцтва побач з грамадзянскім афармленнем шлюбу звяртаецца да абраду вянчання ў хрысціянскіх бажніцах. І гэты абрад у апошнія гады працягвае пашырацца. Захаваўся ў рэспубліцы рытуал ускладання кветак пасля рэгістрацыі шлюбу да помнікаў, абеліскаў, Вечнага агню, які узнік у савецкі перыяд.

Шырокае распаўсюджанне мае вясельнае застолле. У цяперашні час сярод беларускага насельніцтва распаўсюджаны традыцыйны вясельны абрад у скарочаным выглядзе (або вечарына з некаторымі традыцыйнымі элементамі ці без іх), так званае сучаснае вяселле. Ва ўсіх выпадках захоўваюцца ўсё ж рысы традыцыйнай вясельнай урачыстасці, як, напрыклад, размяшчэнне маладых і гасцей у час застолля, абдорванне маладых, спяванне песень і інш. Аналіз сабраных дадзеных пра вясельнае застолле дае магчымасць сцвярджаць, што ў сельскай мясцовасці захавалася вяселле, якое праходзіць у доме жаніха і ў доме нявесты (праўда, скарочанае ў параўнанні з традыцыйным). Але ўсё часцей сустракаюцца сумесныя застоллі радні маладога і маладой.

Застаўся ў вясельнай абраднасці і такі традыцыйны элемент, як наяўнасць на застоллі каравая. У асобных месцах Паўночна-Заходняй Беларусі захаваўся стаўбавы абрад. Існуе на вяселлі прагалошанне тостаў, пажаданняў як фальклорнага, так і сучаснага характару.

У наш час знікаюць камсамольскія і безалкагольныя вяселлі, якія ўкараняліся ў 60-я--80-я гады.

Выкарыстоўваюцца на вяселлі розныя гульнявыя элементы. Гэта жартоўныя іспыты гаспадарчых уменняў маладажонаў, конкурсы, павучэнні, традыцыйныя элементы, якія ператварыліся ў гульню: выкраданне нявесты, падстаўныя жаніх і нявеста, пераапрананне ў «цыганоў», «дактароў» і інш.

Нашы дадзеныя сведчаць аб тым, што ў апошнія дзесяцігоддзі адраджаецца традыцыя забеспячэння маладых пасагам як з боку нявесты, так і з боку жаніха. Цікава адзначыць, што істотная група насельніцтва ўсіх узростаў становіцца адносіцца да пасагу. Склад пасагу таксама стаў іншым у параўнанні з мінулым.

У сучаснай вясельнай абраднасці існуюць негатыўныя моманты, якія вядуць да страты пэўнай часткі культурнай спадчыны беларускага народа. Гэта ставіць перад работнікамі культуры задачы па адраджэнню і захаванню лепшых традыцый вясельнай абраднасці.

Вітошкіна З.М.,
ст.выкладчык

## ПЛАСТЫКА-ХАРЭАГРАФІЧНАЕ ВЫРАШЭННЕ СВЯТА

У сучасны момант узрастае цікавасць да мастацкай творчасці народа. За апошнія гады адноўлена шмат абрадаў, свят, гульняў каляндарнага цыкла, розных рамёстваў.

Нельга не ўбачыць узрастаючага ўплыву фальклору на сучаснае жыццё харэаграфіі, пластыкі. Калі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаварыць аб музычна-танцавальным фальклоры, то яго ўплыў адзначаецца ў бытавой харэаграфіі, пантаміме; спартыўнай харэаграфіі, пластыцы ў вялікіх відовішчах; музычна-харэаграфічнай самадзейнасці; прафесійным музычна-харэаграфічным мастацтве.

Пры арганізацыі свят увага студэнтаў, будучых рэжысёраў, звяртаецца на ўменне працаваць у садружнасці з кампетэнтнымі спецыялістамі ў галіне харэаграфіі, спорту, музыкі і інш. Адначасова студэнты вучацца крытычнаму адбору каштоўнасцей ў музычна-танцавальным фальклоры.

Даволі цікавым з'яўляецца пластыка-харэаграфічнае рашэнне відовішчаў на гістарычную тэму.

У свяце, прысвечанаму 600-годдзю г.Маладзечна, была выкарыстана пластыка спартыўнай рэжысуры. На плошчы, дзе праходзіла адкрыццё свята, фон усяго дзеяння стваралі 240 удзельніц у касцюмах блакітнага колеру з гірляндамі, якія спалучалі сіні колер з сярэбраным. Цікавым выкананнем задумы рэжысёра было сказанне сіваволосага старога аб гісторыі края пад гукі старадаўняга інструмента. Каля ног казачніка пераліваліся хвалі ракі.

На працягу ўсёй дзеі ў залежнасці ад зместу эпізода ўдзельніцы стваралі арнамент то ў выглядзе прамых ліній, ромбаў, кругоў, перасякальных ліній, то ў выглядзе крыжыкаў.

Удзел студэнтаў у падрыхтоўцы такіх відовішчаў развівае іх прафесійныя здольнасці, дапамагае знаёмству са спадчынай беларускай нацыянальнай культуры.

Галіцкая Н.П.,
выкладчык

## ПАЧЫНАЛЬНІК МУЗЫЧНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ А.ГРЫНЕВІЧ

А.Грыневіч быў нястомным прапагандыстам беларускай нацыянальнай культуры. Пасля заканчэння Дзісненскага гарадскога вучылішча Грыневіч трапіў у Петраград, дзе, працуючы служачым у дэпартаменце гандлю і прамысловасці, папаўняе сваю адукацыю вячэрнімі заняткамі. Стаўшы членам выдавецкага таварыства «Загляне сонца і ў наша ваконца», у кругу сяброў прафесара Эпімах-Шыпілы ён знаёміцца з Янкам Купалам.

У 1910 годзе на свае асабістыя сродкі Грыневіч выдае сабраныя на працягу чатырох год «Беларускія песні з нотамі», а потым -- зборнік паэзіі Янкі Купалы «Гусляр». У названым выдавецкім таварыстве з 1910 г. па 1914 г. выходзіць другі томік «Беларускіх народных песень з нотамі», падрыхтаваны Грыневічам сумесна з Зязюляй, «Адвечная песня» Купалы, тры зборнікі апавяданняў Якуба Коласа, апавяданні Уладзіміра Галубка і інш.

Паралельна з выдавецкай дзейнасцю ўсе гады, асабліва ў летні час, Грыневіч рупліва збіраў беларускі народны мелас, выступаў у друку. З 1918 года ён працуе ў Беларускім нацыянальным камітэце, дзе загадвае мастацкай падсекцыяй, а таксама працуе ў Беларускім народным доме, дзе вядзе заняткі ў драматычнай трупе і хоры. Адначасова з гэтым выкладае спевы ў школе, завяршае працу над першым беларускім музычным дапаможнікам «Школьны спеўнік», заснаваным цалкам на нацыянальным песенным матэрыяле.

Грамадзянская вайна закінула беларускага дзеяча ў Вільню. Грыневіч плануе выданне музычна-этнаграфічнага зборніка беларускіх народных песень, запісаных ім у 1906--1920 гадах, а таксама падручніка «Навука спеву» і інш. Але ж не ўсе з падрыхтаваных матэрыялаў у Вільні ўбачылі свет. У 30-х гадах, ратуючыся ад буржуазнай улады, Антон Грыне-віч вымушаны быў пакінуць Вільню і пераехаць у Мінск. У Мінску, працуючы ў Акадэміі навук БССР, ён прымае актыўны ўдзел у экспедыцыях на Палессе, Полаччыну, у паўночныя раёны Беларусі, дзе запісвае народныя песні, танцы, дзіцячы фальклор, а таксама выступае ў перыядычным друку па пытаннях нацыянальнай культуры.

Уся спадчына Антона Грыневіча, у тым ліку і тая, што засталася ў архіўных сховішчах Вільнюса (да тысячы запісаў беларускіх народных мелодый), сведчыць аб вялікай каштоўнасці прапагандысцка-збіральніцкай дзейнасці гэтага нястомнага, руплівага працаўніка на ніве беларускай нацыянальнай культуры.

Трамбіцкая В.І.,
ст.выкладчык

## АКТЫВІЗАЦЫЯ ЗАСВАЕННЯ ФАЛЬКЛОРУ ДЗЕЦЬМІ ПРАЗ ЗАХАВАННЕ ВУСНЫХ ТРАДЫЦЫЙ НАРОДНАГА ВЫКАНАННЯ

Увага да фальклору набыла ў нашым грамадстве вялікую актуальнасць. Фальклор -- не вычэрпная кры-ніца мастацкай творчасці -- мае велізарныя перспектывы і ў музычнай педагогіцы, бо толькі ў непасрэдным успрыманні і асэнсаванні музычных з'яў, у засваенні мастацкіх заканамернасцей музычнай спадчыны закладваецца фундамент сапраўднага мастацкага мыслення дзіцяці.

Важнай рысай фальклору з'яўляецца вуснасць. Фальклор не ведаў пісьмовай фіксацыі, таму выкананне кожнага твора з улікам творчых асаблівасцей выканаўцы заўсёды было з'явай. Мастацтва народных музыкантаў, хоць і абапіралася на традыцыю, было імправізацыйным.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ